СЦЕЖКАМІ КАНТРАБАНДЫСТАЎ

Шмат цікавых гісторый пра мінулае гэтых мясцін ведае краязнавец, кіраўнік фонду «Краіна замкаў» Алесь ВАРЫКІШ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Да таго ж «надышоў жнівень. Набліжаўся залаты сезон. На ўсёй граніцы запанаваў рух». Гэта ўжо цытата з «Каханка». Губляць час было нельга, таму мы з фотакарам Яўгенам Пясецкім па гродзенскай трасе накіраваліся на захад ад сталіцы. Тым больш што маршрут быў загадзя вызначаны па «навігатары» рамана. Атрымалася, выехалі з Пясецкім, каб прайсціся сцежкамі яго легендарнага цёзкі — беларускага Бонда. Нашым «гідам» падчас своеасаблівай літаратурна-гістарычнай рэканструкцыі стаў **кіраўнік фонду «Краіна замкаў» Алесь ВАРЫКІШ**. Так «на трох» мы «распісалі» адметны маршрут.

...«Рушым па старой менскай трасе, — заўважае Алесь Варыкіш. — Наперадзе — вёска Гарані (на гары стаіць). Зусім хутка даімчым да тых мясцін, дзе праходзіла мяжа». І сапраўды — праз колькі хвілін спыняемся на колішняй савецка-польскай мяжы, толькі цяпер гэта мяжа Мінскага і Валожынскага раёнаў. «Вунь там, унізе, ручай бяжыць, якраз тут амаль стагоддзе таму праходзіў падзел, — тлумачыць Алесь. — Пакуль яшчэ на колішнім савецкім баку знаходзімся, а ступім пару крокаў — і ўжо на тагачаснай польскай тэрыторыі апынёмся». Толькі лясы цяпер іншыя. Калісьці гэта была Налібоцкая пушча, часцяком дубровы. «Размясціўся на ўскрайку дубовага бору. Ён быў цудоўны. Дубы стаялі высокія, стромкія. Кроны пачыналіся высока над зямлёй», — так апісваў наваколле Пясецкі (Сяргей, зразумела). Магутны гушчар актыўна высякалі — і да Вялікай Айчыннай, і пасля, калі патрэбна была драўніна, каб адбудоўвацца пасля ваенных віхур.

Злева можна прыкмеціць стары савецкі дот, які, праўда, быў узведзены пазней часоў, якія апісваюцца ў «Каханку», — напрыканцы 1930-х. А вось траса згадваецца Пясецкім неаднойчы. Вось напрыклад: «Сяджу на беразе высокага, у некалькі метраў, адхону, унізе якога ляжыць тракт, што вядзе з Ракава на Менск. У левай руцэ трымаю ліхтарык, у правай зараджаны парабелум». Як вам такі «антураж»? Вось і я, увайшоўшы ў ролю, пачынаю нервова аглядацца па баках.

Пакуль на савецкай тэрыторыі. Зразумела, не толькі лес наўкола, а і сцежкі цяпер зусім іншыя. Але захавалася ўсё ж у гэтых мясцінах нешта, што і сёння прыцягвае быццам магнітам. Тым часам выязджаем на другую кальцавую. «Гэтая траса пракладзена якраз уздоўж старой мяжы, прынамсі на гэтым участку, — заўважае Алесь Варыкіш. — Каля Ракава колішняя мяжа паварочвала на поўдзень».

Рушым менавіта ў гэты «кут». Аксакаўшчына, пасля тое самае Вялікае Сяло. Менавіта тут, паводле «Каханка» варта шукаць адметны курган. «Капітан з дачкой даехалі да Менска, а пасля пехатой пайшлі ў Ракаў. Уначы каля Вялікага Сяла заблудзіліся, і недалёка ад граніцы іх пераняў савецкі патруль», — піша Пясецкі. Скончылася ўсё трагічна: капітан загінуў, а дачка здолела збегчы і пасялілася на адным з хутароў. Ад таго часу курган, дзе быў забіты царскі афіцэр, называюць Капітанскай магілай. Праўда, ніхто з месцічаў дакладна не пакажа вам гэтае месца. Курганы засталіся, але які з іх «капітанскі» — невядома. «Падзеі, якія апісвае Пясецкі, адбываліся насамрэч на зломе эпох, — кажа Алесь Варыкіш. — Былі зламаны ўклады, якія фарміраваліся стагоддзямі. Уяўляеце, як адчувалі сябе людзі, якія апынуліся на перадавым краі гэтых жорсткіх, без перабольшвання крывавых падзей».

Абапал колішняй мяжы была раскідана незлічоная колькасць асобных фальваркаў, двароў, хутароў. Менавіта тут у 1920-я былі тыя самыя «мяліны», куды з таварам прабіраліся кантрабандысты-перамытнікі. На савецкі бок перапраўлялася разнастайная мануфактура і «спірытус», а на польскі — золата і футра («скуркі»). Чаму менавіта восень лічылася «залатым сезонам»? Зусім не ад багатага колеру лістоты, а з таго, што «глухія восеньскія ночы надоўга атуляюць зямлю». Менавіта ў гэты час «граніца кіпіць жыццём. Партыя за партыяй, ноч у ноч перамытнікі ідуць за граніцу. Яны працуюць шалёна. Амаль не бачым дзённага святла, бо ўдзень спім пасля доўгай працоўнай ночы».

Без перабольшвання ўсе шляхі ў пачатку 1920-х вялі ў Ракаў. Мястэчка на польскім баку становіцца «сталіцай кантрабандыстаў». Справа была арганізавана з размахам. Запраўлялі яўрэйскія гандляры (дарэчы, у мястэчку тых часоў налічвалася больш за сотню крамаў), яны забяспечвалі таварам групы перамытнікаў, якія вадзілі цераз мяжу вопытныя праваднікі-«машыністы». Шыбавалі на «мяліну» па той бок мяжы, а адтуль, па магчымасці таксама з грузам, — на польскі бок. Зразумела, нехта ішоў з «ношкай», а хтосьці пераганяў тавар вазамі. У большасці, канешне, групы фарміраваліся з людзей, якім проста трэба было неяк пракарміцца. «Беспрацоўе ў той час было проста страшэннае, — заўважае Алесь Варыкіш. — Успомніць хоць бы «Жыццё раззброенага чалавека» таго ж Пясецкага. Колькі аказалася «лішніх» людзей, да якіх нікому не было справы. Вось і шукалі яны любой магчымасці заробку».

Акрамя тавару цераз мяжу «перакідвалі» і людзей — «фігуркі». Варта было паспрабаваць, а пасля зацягвала — як пісаў Пясецкі, «адчуваў, што кінуць было б цяжка». Ды і грошы — цераз Ракаў праходзілі «залатыя рэкі». Нездарма ў мястэчку было звыш 80 рэстаранаў, у кожным з якіх працаваў свой аркестр. Сярод іх — апісаны ў рамане салон у Гінты. Сёння ўсё больш сціпла. Дакладна з тых часоў засталіся царква і касцёл, ля якога, дарэчы, галоўны герой «Каханка» чакаў з імшы Фэлю Вэблінянку. А мы менавіта на гэтым месцы сустрэлі прыгожую жанчыну — **выкладчыцу Ракаўскай школы мастацтваў Юлію МЯКІНКУ.** І, канешне ж, прыгадалі Сяргея Пясецкага. «2 верасня ў нас адбудзецца «Ракаўскі фэст», падчас якога пройдзе таксама квэст па творах Пясецкага, — кажа Юлія Мякінка. — Завітайце — будзе цікава». Сустрэча з Юліяй — чыстая імправізацыя, аб сустрэчы, паверце, папярэдне не дамаўляліся. І ў гэтым увесь Ракаў — нечаканы, усмешлівы, старажытны. Тут можна знайсці вулачку, якая быццам на «машыне часу» правядзе вас праз стагоддзі.

...Час вяртацца. Спыняемся ў Новым Полі, дзе яшчэ захавалася колішняя сядзіба Друцкіх-Любецкіх. У Ракаве на старых могілках пахаваны маладая князёўна Крысціна і яе маці. Сям'я перабралася ў мястэчка, калі іх маёнтак аказаўся на савецкай тэрыторыі. Крысціна любіла ездзіць каля мяжы і ўглядацца ў родныя мясціны. І аднойчы стала адной з ахвяр мяжы...

А Сяргей Пясецкі, які быў агентам трох разведак (польскай, англійскай і французскай), 10 гадоў адседзеў у турме, дзе, дарэчы, пачаў пісаць. Пераехаў у Італію, а пасля ў Англію. Працаваў над сваімі творамі да самай смерці. Кажуць, што працягваў супрацоўніцтва з брытанскімі спецслужбамі і нават выкладаў у разведшколе. Быў знаёмы з «бацькам» Джэймса Бонда — Янам Флемінгам. Сяргей Пясецкі пахаваны ў Гастынгсе, на яго надмагіллі высечаны сем зорак Вялікай Мядзведзіцы. «Гляджу ўлева на Вялікую Мядзведзіцу і ўсміхаюся. Паўтараю імёны асобных зорак: Эва, Ірэна, Зося, Марыля, Гэлена, Лідзія і Леаніда... Лёня».

Мікалай ЛІТВІНАЎ.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Такі ж блакіт ажыўляе строгую гаму старых мураваных сцен і валоў.

Тут амаль сто гадоў таму пракладалі свае таямнічыя сцежкі мясцовыя кантрабандысты — персанажы твораў Сяргея Пясецкага.



Дзяржаўная граніца паміж БССР і Польшай праходзіла пад Ракавам, аб чым сведчаць старыя карты. Праз мясцовыя лясы пралягалі нябачныя сцежкі тагачасных кантрабандыстаў.

Ёсць сярод гаспадароў прыхільнікі старых назваў вуліц.

Пра сённяшні дзень старажытнага Ракава і яго будучыню кампетэнтна расказвае Юлія МЯКІНКА — выкладчык мясцовай школы мастацтваў. Землякі абралі яе сваім дэпутатам у Валожынскі раённы Савет.